Аўтар: Рэдакцыя
15.05.2022 22:04

Адышоў у вечнасць Станіслаў Шушкевіч – вядомы беларускі вучоны, палітычны і грамадскі дзеяч, які прычыніўся да вяртання каталіцкіх святынь вернікам. Сярод іх – катэдральнага касцёла Найсвяцейшага імя Марыі і касцёла святых Сымона і Алены (Чырвонага касцёла) у Мінску.

Быў сынам беларускага пісьменніка Станіслава Шушкевіча, рэпрэсіраванага савецкімі ўладамі. Займаўся фізіка-матэматычнымі навукамі і ядзернай фізікай. Быў народным дэпутатам СССР і БССР.

18 кастрычніка 1991 года Станіслаў Шушкевіч быў абраны старшынёй Вярхоўнага Савета і стаў фактычна першым лідарам незалежнай Беларусі, якая ў той час была парламенцкай рэспублікай.

Спадар Станіслаў адышоў у вечнае жыццё 3 мая ў Мінску, маючы 87 гадоў. Вечны супакой дай яму, Пане…

“А Я вам кажу: не адплачвайце злому. Калі хто ўдарыць цябе па правай шчацэ тваёй, падстаў яму і другую” (Мц 5, 39).

Гэтае правіла не трэба разумець у тым сэнсе, што Езус забараняе самаабараняцца і загадвае, каб хрысціянін кожны раз падстаўляў сваю галаву. Езус сам атрымаў па твары падчас праслухоўвання ў Анны. Ці падставіў другую шчаку? Не! Таму, хто біў, Ён задаў пытанне: “Калі Я дрэнна сказаў, дакажы, што дрэнна, а калі добра, то чаму б’еш Мяне?”. Не ў тым справа, каб падстаўляць твар для біцця, але каб чалавеку, што прымяняе фізічную сілу, супрацьпаставіць магутнасць маральнай сілы, якая нашмат мацнейшая за фізічны гвалт. “Бласлаўлёныя ціхія, таму што яны ўнаследуюць зямлю”. Езус даказаў, што маральная сіла нашмат мацнейшая за гвалт.

Аўтар: Рэдакцыя
15.05.2022 22:04



